# ПАДАРОЖЖА ПА ВІРТУАЛЬНЫМ ЧАСОПІСЕ «ПРЫРОДА РОДНАГА КРАЮ» (УРОК ПА ПРАДМЕЦЕ “ЧАЛАВЕК І СВЕТ” У 1-М КЛАСЕ)

**Харчанка Наталля Леанідаўна,**
настаўнік пачатковых класаў
ДАУ «Шпакоўшчынская базавая школа Полацкага раёна»

## *Любоў да Радзімы праз любоў да прыроды*

*Дадзеная распрацоўка ўрока адрасуецца (прапануецца) настаўнікам пачатковых класаў для правядзення яго ў першым класе па прадмеце “Чалавек і свет”. Тэма і змест урока адпавядаюць вучэбнай праграме і каляндарна-тэматычнаму планаванню. Ён накіраваны на тое, каб вучні даведаліся пра асноўныя змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной, пазнаёміліся з некаторымі відамі пералётных птушак, а таксама засвоілі галоўныя правілы паводзін у прыродзе гэтай парой года. Чырвонай лініяй праз увесь урок праходзіць матэрыял, які садзейнічае грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню першакласнікаў.*

**Тэма ўрока:** Змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной.

**Мэта:** у прыканцы ўрока вучні будуць мець уяўленне пра асноўныя змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной.

**Задачы:**

– фарміраваць уяўленні вучняў пра вясновыя змены ў жыцці дзікіх жывёл і ўзаемасувязі ў прыродзе; пашырыць веды аб пералётных птушках, садзейнічаць усведамленню важнасці перыяду іх гнездавання;

– стварыць умовы для развіцця пазнавальных працэсаў (увагі, памяці, мыслення), уменняў устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі;

– садзейнічаць выхаванню грамадзянска-патрыятычных пачуццяў, беражлівых адносін да жывёл.

**Форма правядзення:** падарожжа па віртуальным часопісе “Прырода роднага краю”.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Абсталяванне ўрока:** падручнік “Чалавек і свет. 1 клас”, сшытак на друкаванай аснове “Чалавек і свет.1 клас”; мультымедыйная прэзентацыя (дадатак), мульцiборд; карткі: сігнальные, для парнай работы “Засялі домікі” (з “домікамі” і выявамі дзікіх жывёл), з назвамі вясновых месяцаў; малюнкі трох перыядаў вясны, дрэва, кветак, зубра, птушак, пчолак і смайлікі для рэфлексіі; карткі для самаацэнкі “Скарбонка ведаў”, для вызначэння настрою (сонейка і хмарка).

**Ход урока**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап** (слайд № 1)

Празвінеў ужо званок,
Пачынаецца ўрок.
Нельга нам, сябры, ляніцца.
У школу мы прыйшлі вучыцца.
Пачынаем наш урок.

– А ўрок наш сёння незвычайны. Я запрашаю вас у госці да віртуальнага часопіса “**Прырода роднага краю”.** Чаму будзе прысвечаны гэты нумар часопіса, вы даведаецеся крыху пазней. А зараз паслухайце верш:

Сонца грэе, прыпякае;
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.
Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія крычаць,
Шпак на дубе расспяваўся,
Жураўлі ўжо ляцяць.
І зіма, як дым, прапала!
Зелянее луг, ралля.
Як ад болю ачуняла
Наша родная зямля.

– Гэтыя прыгожыя радкі напісаў вядомы беларускі паэт і пісьменнік Якуб Колас. Скажыце, аб чым гэты верш, аб якой пары года? (*Аб вясне.*) Па чым вы дазналіся, што гэта вясна? *(Лёд на рэчцы затрашчаў, гусі дзікія, жураўлі ляцяць,*

*шпак расспяваўся, зіма прапала, зелянее луг, ралля.)* Правільна, малайцы! А можна сказаць, што аўтар любіць сваю зямлю, сваю краіну? (*Так.)* Якія словы нам гэта падказваюць? (*Наша родная зямля.*) Добра. Малайцы!

**II. Актуалізацыя ведаў вучняў. Тэма і мэта ўрока**

– Дзеці, я нездарма пачала ўрок з верша Якуба Коласа.

– Адкажыце, якая зараз пара года? *(Вясна.)* Якія веснавыя месяцы вы ведаеце? *(Сакавік, красавік, май (назвы месяцаў на дошцы).)*

– Колькі перыядаў у вясны? *(Тры.)*

– Назавіце іх. *(Вясна святла і сонца, вясна вады і вясна зелені (вывешваем малюнкі вясны на дошку пад назвамі месяцаў).)*

– На папярэдніх уроках мы з вамі гаварылі пра вясеннія змены ў нежывой прыродзе, пра абуджэнне раслін. Давайце ўспомнім, якія змены адбываюцца ў нежывой прыродзе вясной? (*Сонца вышэй паднімаецца над зямлёй, свеціць даўжэй і грэе мацней. У сонечныя дні неба ярка-блакітнага колеру. Дзень прыбывае, а ноч убывае. Часцей ідуць дажджы, а снег выпадае рэдка, растае снег і лёд. Пачынаецца крыгаход.*) А што адбываецца з раслінамі вясной? (*Пачынаецца рух соку ў дрэў і кустоў. На іх галінках набракаюць пупышкі і распускаецца лісце, і многія з іх зацвітаюць (вярба, вольха, ляшчына, асіна). Пачынаюць квітнець і некаторыя травяністыя расліны-першацветы (падбел, прымула, пралеска, медуніца і інш).*) Як трэба адносіцца да першацветаў? Чаму да раннеквітнеючых раслін трэба адносіцца беражліва? *(Таму што многія першацветы гінуць, калі сарваць іх надземную частку вясной, і яшчэ яны з’яўляюцца адзінай крыніцай харчавання для насякомых, якія толькі прачнуліся пасля зімы.)* Вы памятаеце, што многія першацветы занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, а гэта значыць, што яны ахоўваюцца нашай дзяржавай, іх нельга зрываць. Не будзем іх збіраць? *(Не.)* Будзем любавацца імі на палянцы!

– Зараз настаў час даведацца, чаму ж будзе прысвечаны нумар нашага часопіса. Вы аб гэтым здагадаецеся, калі збераце “рассыпаныя словы”. *(Вучні выходзяць да дошкі (на дошцы “дзікія жывёлы”) і складаюць словы.)* Малайцы! Правільна, мы будзем гаварыць аб дзікіх жывёлах. Тэма нашага ўрока *(адкрываю на дошцы):* ***змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной*** *(чытаюць хорам).*

– Аб чым мы даведаемся на ўроку? (*Аб зменах у жыцці дзікіх жывёл вясной.)*

– Правільна! А яшчэ мы пазнаёмімся з рознымі відамі пералётных птушак, даведаемся, ад чаго залежыць іх прылёт і замацуем правілы паводзін у прыродзе вясной.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу**

– А дапаможа вам у гэтым наш віртуальны часопіс. Але спачатку выканаем заданне.

У вас на партах ляжаць карткі з выявамі жывёл. А якія гэта жывёлы, дзікія ці свойскія? *(Дзікія.)* Правільна. Вы павінны раздзяліць іх на групы і “засяліць” у домікі. Працуем у парах, адзін вучань – ля дошкі.

– Як назваць адным словам дзікіх жывёл, якіх вы засялілі ў першы домік? У другі? У трэці? *(Насякомыя, звяры, птушкі.)* Малайцы!

– Першая старонка нашага часопіса **“Абуджэнне насякомых”** (слайд № 2).

– На гэтай старонцы нас гасцінна вітаюць Мурашка і Пчолка. Гэтыя насякомыя – сапраўдны сімвал працавітасці і дружбы. А мурашка яшчэ лічыцца адной з самых дужых жывёл на Зямлі, таму што яна можа несці груз, цяжэйшы за саму сябе ў 20 разоў! А некаторыя – нават у 50 разоў! А пра пчолку складзена шмат вершаў і прыказак. Напрыклад, кажуць: працавітая, як пчолка.

Пчолка і Мурашка прапануюць вам паглядзець відэаролік, які пазнаёміць вас са зменамі ў жыцці насякомых вясной.

**Гутарка па ролiку:**

– *Якія перамены адбываюцца ў жыцці насякомых вясной?(Яны прачынаюцца і пачынаюць шукаць сабе корм.)*

*– Якіх насякомых можна ўбачыць у пачатку вясны? Дзе мы іх можам сустрэць? Чым яны кормяцца?*

*– Давайце крышачку адпачнём. Устаньце і ўявіце сябе матылькамі.*

**Фізмінутка** *(анімацыйная)*

***Матылёчкі на луг прыляцелі, пакружыліся над кветачкамі, на кветачкі селі, нектару паелі, затым зноў крылцы расправілі і паляцелі.***

– Перш,чым працягнуць наша падарожжа, ацаніце, калі ласка, свае веды пра жыццё насякомых вясной. У вас на партах ёсць пчолкі. Вазьміце іх. Калі вы лічаце, што ведаеце аб жыцці насякомых вясной дастаткова і можаце падзяліцца сваімі ведамі з іншымі, то пасадзіце пчолку на вялікую кветачку, калі лічаце, што ведаеце яшчэ недастаткова добра – на маленькую кветачку, а калі вы нічога не ведаеце і не запомнілі – на лісцік.

– Мы працягваем падарожжа. Другая старонка нашага часопіса **“Пералётныя птушкі”** (слайд № 3). А сустракае нас гаспадар гэтай старонкі… Вы пазналі яго? Так, гэта бусел. Што вы ведаеце пра гэтую птушку? *(Расказвае падрыхтаваны вучань: – Гэта пералётная птушка, прылятае звычайна ў красавіку, калі з’яўляюцца жабы, гадзюкі, мышы.)*

– Бусел – сімвал міру, мудрасці і нацыянальнай чысціні. Больш падрабязна пра гэтую

птушку мы з вамі даведаемся на пазакласных занятках.

– А зараз скажыце, якіх яшчэ пералётных птушак вы ведаеце?

– А чаму яны называюцца пералётнымі? (*Яны адлятаюць на зіму ў цёплыя краіны.)*

– Чаму яны гэта робяць? (*Ратуюцца ад бяскорміцы.*) Малайцы!

– Буслік прапануе вам паглядзець відэаролік пра жыццё птушак вясной *(відэаролік).*

**Гутарка па ролiку:**

– Што вы даведаліся пра жыццё пералётных птушак вясной, пра якія асноўныя змены*? (Яны вясной вяртаюцца з выраю, робяць гнёзды і выводзяць птушанят.)*

– Ад чаго залежыць, калі прыляцяць птушкі? *(Ад таго, калі з'явіцца корм для іх.)*

– Давайце зараз пагуляем з вамі. У вас на партах ляжаць малюнкі птушак. Вазьміце іх у рукі, прымацуйце да сябе. Зараз вы птушкі. Прыгрэла веснавое сонейка, на зямлі з'явіліся першыя праталіны. Ляціце дадому. *(Дзеці "ляцяць" (слайд № 4).)*

– Ці для ўсіх вас ёсць корм? *(Не. Буслы кормяцца жабамі, змеямі, а ластаўкі – камарамі ды мошкамі. Зязюлі – вусенямі. Качкі – жабамі, апалонікамі, травой).* "Птушкі", якія "прыляцелі" рана, вяртаюцца за парты.

– Дык якія птушкі прылятаюць першымі? *(Гракі.)* А за імі? *(Шпакі і жаўрукі.)*

– Сышоў з палёў снег, рэкі вызваліліся ад ільду, з'явіліся жабы, змеі. Хто ляціць у родны край? *(Бусел і качка.)*

– Дрэвы і кусты апрануліся ў лісце, з'явіліся камары, мошкі, вусені. Хто да нас ляціць з выраю? *(Ластаўка, зязюля.)* Малайцы!

– Буслік прапануе вам выканаць заданне № 3 на с. 49 у сшытку, самастойна. Трэба вызначыць, у якім месяцы прылятае кожная птушка, і зафарбаваць кружок патрэбным колерам. *(Праверка франтальная, з дапамогай сігнальных картак.)*

**Работа з падручнікам**

– Адкрыйце, калі ласка, падручнік на с. 51. Разгледзьце малюнкі, змешчаныя знізу. Што вы заўважылі? Чаму зязюля трымае яйцо ў дзюбе, а не ў гняздзе? Можа, мастак памыліўся, што не намаляваў гняздо ля зязюлі? Што вы ведаеце пра зязюлю? *(Адказы дзяцей.)*

– А зараз ацаніце свае веды пра пералётных птушак. Калі вы атрымалі шмат новага, вам было цікава, вы ведаеце, якія змены адбываюцца ў жыцці птушак вясной, то пасадзіце сваю птушачку на самую высокую галінку. Калі ў вас засталіся яшчэ пытанні, не ўсё зразумела – на галінку ніжэй. А калі вы нічога не зразумелі, нічога не запомнілі і вам было нецікава, то пасадзіце птушачку на самую нізкую галінку.

– Наступная старонка нашага часопіса "**Звяры запрашаюць у госці"** (слайд № 5).

– Як вы думаеце, аб чым мы даведаемся, калі пабываем на гэтай старонцы?

– Так, зразумела, аб жыцці лясных звяроў вясной. А вітае нас яшчэ адзін сімвал Беларусі – зубр. Што вы ведаеце пра гэту жывёлу? *(Расказвае падрыхтаваны вучань: – Гэта магутны бык. Ён занесены ў Чырвоную кнігу, а значыць, ахоўваецца нашай дзяржавай. 100 гадоў назад зубры былі на мяжы знікнення. Зараз толькі на тэрыторыі Беларусі іх налічваецца больш за паўтары тысячы. Месца пражывання – Белавежская пушча і Бярэзінскі запаведнік.)*

– Зубр – гэта нацыянальны сімвал Беларусі, сімвал магутнасці нашай краіны.

Зубраня прапануе вам прагледзець ролік аб вясновых зменах у жыцці звяроў *(відэаролік).*

**Гутарка па ролiку:**

– Што адбываецца ў жыцці звяроў вясной? *(Некаторыя прачынаюцца ад зімовай спячкі, пачынаюць шукаць сабе ежу. Усе яны ліняюць, некаторыя з іх мяняюць афарбоўку поўсці (заяц, вавёрка). У большасці звяроў вясной з'яўляюцца дзіцяняты.)*

– Як трэба сябе паводзіць у лесе вясной? (*Асцярожна, не шумець, каб не спудзіць дзіцянят звяроў і птушак.)*

– А зараз давайце адпачнём. Запрашаю вас на вясёлую фізмінутку.

**Фізмінутка** *(*жывёлы*, анімацыйная)*

– Ацаніце ўласныя веды пра жыццё звяроў вясной. Падарыце нашаму Зубрыку смайлікі. Калі вы пазналі нешта новае пра жыццё звяроў вясной, вам было цікава, то падарыце вясёлы смайлік. Калі новага вы не даведаліся (ужо ўсё ведалі, аб чым казалі), то сур'ёзны, а калі вам было зусім нецікава, вы нічога не даведаліся і не запомнілі, то сумны смайлік.

– Працягнем наша падарожжа. Наступная старонка віртуальнага часопіса раскажа нам, як жа сустракаюць вясну іншыя дзікія жывёлы. Увага на экран *(відэаролік (слайд № 6).)*

– Якіх жывёл вы ўбачылі? (*Жаб, змей, чарапах і яшчарку.*)

– З надыходам вясны гэтыя жывёлы прачынаюцца ад зімовай спячкі. Яны грэюцца на веснавым сонейку, актыўна кормяцца і рыхтуюцца да з'яўлення патомства.

**IV. Абагульненне, замацаванне**

– На наступнай старонцы часопіс прапануе вам праверыць свае веды, якія вы атрымалі сёння на ўроку, по тэст-віктарыне. Вы гатовы? Тады пачынаем *(віктарына-тэст (слайд № 7–8).)*

– Малайцы! Вось мы і закончылі наша падарожжа па віртуальным часопісе "Прырода нашага краю". У канцы выдання ёсць змест. Давайце яго

прачытаем і ўспомнім, аб чым мы сёння даведаліся *(калектыўна чытаюць змест (слайд № 9).)*

**V. Вынік урока, рэфлексія**

– Аб якіх зменах у жыцці дзікіх жывёл вясной мы даведаліся? *(Вясной прылятаюць пералётныя птушкі, уюць гнёзды, выводзяць птушанят. Прачынаюцца насякомыя. Прачынаюцца некаторыя звяры (мядзведзі, барсукі, вожыкі, а таксама жабы, яшчаркі, змеі). У звяроў адбываецца лінька, некаторыя з іх мяняюць афарбоўку поўсці (заяц, вавёрка). У многіх звяроў вясной з'яўляецца патомства.)*

– Як трэба сябе паводзіць вясной у прыродзе? *(Нельга шумець, чапаць гнёзды птушак і іх яйкі, а таксама птушанят.)*

– Ад чаго залежыць прылёт птушак? *(Ад з'яўлення корму.)*

– А чаму птушкі вяртаюцца ў Беларусь з цёплых краін, дзе шмат корму*? (Яны вяртаюцца, бо тут іх дом.)*

– Малайцы! Так і чалавек, як птушка, заўсёды імкнецца на Радзіму, дзе б ён ні быў. Таму што Радзіма – маці, а чужына – мачаха. Заўсёды трэба любіць Радзіму, як сваю маці.

– Вось і завяршаецца наш урок.

– Пакажыце, калі ласка, колькі ведаў вы паклалі сёння ў сваю скарбонку. *(Выкарыстоўваюцца карткі самаацэнкі.)*

– А зараз выберацe "смайлік", які адпавядае вашаму настрою.

– Я вельмі рада, што ў вас пазітыўны настрой, што вы атрымалі сёння многа ведаў. Вы вельмі добра працавалі.Дзякую за працу! Урок скончаны!

**ДАДАТАК**